# «ПРЫЙШОЎ ЧАС ДЛЯ СВАБОДНАЙ ТВОРЧАСЬЦІ...»

Ларыса Таірава

Канцэртная зала філармоніі ў гэты вечар была перапоўненая. Нават гардэробшчыца, прымаючы паліто, зьдзівілася: «Гэта ж трэба, нейкае там Маладзечна выступае — і шмат народу...» Ужо яна-то добра ведае, што сабраць такую аўдыторыю можа хіба толькі канцэрт замежнага гастралёра. У апошні час наша парадкам зьбяднелая публіка нячаста наведвае філарманічную залу, таму жанчыне было няўцям, чым жа так прывабіла слухачоў выступленьне артыстаў з перыферыі. На гэты конт даволі трапна выказаўся кампазітар Я. Глебаў, які прысутнічаў на канцэрце: «Сапраўднае мастацтва нараджаецца ў глыбінцы», — хаця Маладзечна глыбінкай назваць ужо нельга, бо яно наблізілася да сталічнага ўзроўню ў плане культуры. І асноўным цэнтрам культурнага жыцьця гэтага невялічкага, утульнага гарадка зьяўляецца музычнае вучылішча на чале з яго дырэктарам Рыгорам Сямёнавічам Сарокам.

Пра канцэрт я раскажу крыху пазьней, а зараз мне б хацелася пазнаёміць чытачоў з чалавекам, дзякуючы якому гэты канцэрт адбыўся.

Лёс Рыгора Сямёнавіча Сарокі — тыповы для чалавека, які ўсяго ў жыцьці дасягнуў сам, дзякуючы свайму таленту, сваёй працаздольнасьці і мэтанакіраванасьці. Нарадзіўшыся ў Маладзечанскім раёне, у вёсцыТурэц-Баяры, у сям'і рабочага вагоннага дэпо, Рыгор Сямёнавіч усё сваё жыцьцё зьвязаў з Маладзечнам. У гэтым горадзе пачалося яго грамадскае і музычнае станаўленьне. Скончыўшы тут дзіцячую музычную школу, потым музычнае вучылішча па класу баяна, Р. Сарока паступае ў БелАМ, дзе пасьпяхова займаецца па класах баяна ў дацэнта В. Пісарчык і аркестравага дырыжыраваньня ў заслужанага артыста РБ А. Майзьлера. Адначасова з гэтым ён пачынае працаваць выкладчыкам у родным вучылішчы, якое ўзначальвае з 1980 года.

Колькі спатрэбілася вытрымкі і такту, цьвёрдасьці і прынцыповасьці, каб у рэшце рэшт атрымаўся такі зладжаны і згуртаваны калектыў аднадумцаў! Усяго хапіла на шляху дырэктара: былі пагрозы, ананімкі, нават судовыя разборкі. Але ж нішто не магло прымусіць Р. Сароку паступіцца прынцыпамі, высокімі прафесійнымі патрабаваньнямі.

Сёньня калектыў вучылішча працуе як добра адладжаны механізм. Тут не апускаюцца да таго, каб зьневажаць выкладчыкаў праверкамі і недаверам. Тут проста створаны ўсе ўмовы для плённай творчай працы. Кожны ведае, што вынік залежыць ад яго здольнасьцяў і стараннасьці, што ўсе намаганьні будуць своечасова заўважаны і адзначаны. У адрозьненьне ад іншых установаў, дзе добраму працаўніку часам забываюць нават сказаць «дзякуй», у Маладзечанскім музвучылішчы варыянтаў падзякі шмат: добрае слова і каштоўны падарунак да юбілею, матэрыяльная прэмія і своечасовая дапамога — усё гэта гуртуе калектыў і спрыяе добраму маральнаму настрою. Толькі за мінулы год Р. Сарока здолеў атрымаць для сваіх выкладчыкаў 5 дзяржаўных і столькі ж кааператыўных кватэр...

Нядаўна мне давялося пабываць у Маладзечне. Некалі я была выхаванкай гэтага вучылішча і добра ведала кожны яго куточак. Цяпер я яго не пазнала. Былы будынак КДБ з прагнілым дахам і ржавымі трубамі ператварыўся ў сапраўдны храм мастацтва. Утульныя класы, прасторная канцэртная зала, шырокія, прыемна афармленыя холы, сьцены якіх упрыгожаны карцінамі, — ад усяго павявае густам, утульнасьцю і матэрыяльным дабрабытам. «Я не толькі грошы, я ўсю душу сюды ўклаў», — адказаў Рыгор Сямёнавіч на мае словы захапленьня.

У дырэктара вучылішча няма прыёмных дзён і гадзін, няма таксама доўгіх чэргаў і запісаў на прыём. Кожны можа прыйсьці да яго ў любы час са сваім пытаньнем. Але зьвяртацца да дырэктара ў большасьці супрацоўнікаў проста няма патрэбы. Вось гэта, на мой погляд, і ёсьць сапраўдная культура кіраваньня, якой нам часам так не хапае.

Сьмеласьці, рашучасьці ва ўчынках і думках Р. Сароку не пазычаць. Яму характэрна абвостранае пачуцьцё часу, уменьне адразу і беспамылкова заўважаць усё прагрэсіўнае, таленавітае. Адзін з першых у Маладзечне ён пачаў размаўляць на беларускай мове і такім чынам паказаў прыклад сваім супрацоўнікам. Убачыўшы арганізатарскія здольнасьці і гаспадарлівасьць колішняга выпускніка вучылішча Славы Рака, Рыгор Сямёнавіч, не вагаючыся, падтрымаў першыя нясьмелыя парасткі прадпрымальніцтва, знайшоўшы ў вучылішчы памяшканьне для майстэрні здольнага хлопца. Зараз гэтая майстэрня ператварылася ў самастойную фірму «Слава», якая займаецца выпускам канцэртных баянаў і зьяўляецца спонсарам гарадскога сімфанічнага аркестра.

Бадай, найбольш сьмелым учынкам Р. Сарокі была арганізацыя выбараў дырэктара. Справа ў тым, што на гэтую пасаду Рыгор Сямёнавіч у свой час быў прызначаны Міністэрствам культуры і мог спакойна заставацца на ёй без усялякіх клопатаў. Сарока большасьцю галасоў атрымаў давер і падтрымку калектыву. На жаль, «уласьніцкія» рысы характару Рыгора Сямёнавіча часам міжволі распаўсюджваюцца не толькі на справы, зьвязаныя з вучылішчам ці аркестрам, але і на падначаленых. Тры гады назад некалькі выкладчыкаў, выдатных салістаў камернага аркестра, мелі намер пэўны час самастойна (як невялічкі ансамбль) папрацаваць у Германіі. Сарока не змог дараваць ім гэткай самастойнасьці, і яны вымушаны былі пакінуць аркестр і вучылішча. Зараз нават цяжка вызначыць, хто ў выніку страціў больш... У сувязі з гэтым міжволі ўспамінаецца выдатны фільм Ф. Феліні «Рэпетыцыя аркестра», дзе ў мастацкай форме якраз і разглядаецца праблема дыктатарства і свабоды. Калі грамадства (аркестр у фільме Феліні) набывае свабоду (застаецца без дырыжора), яму пагражае гібель пад націскам анархіі. Вось тут і думай, што лепш...

Тым не менш Рыгор Сарока шчасьліва спалучае ў сабе рысы выдатнага музыканта, дырыжора, таленавітага арганізатара. На асабістым прыкладзе ён паказаў, як у сучасных умовах можа і павінна існаваць культура. На маё пытаньне, дзе ён знаходзіць сілы для творчага росту і што жывіць яго аптымізм у наш нялёгкі час, Рыгор Сямёнавіч адказаў: «Перш за ўсё, у Маладзечне я сустрэў шмат сяброў і аднадумцаў, якія сапраўды любяць мастацтва. Гэта нашы спонсары: дырэктар малога прадпрыемства «Будаўнік» А. Наседкін, генеральны дырэктар кампаніі «Слава» В. Рак, упраўляючы Маладзечанскага філіяла

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКМ

Віцкамбанка У. Горбат, дырэктар АТ «Будсервіс» М. Бяднюк. Важна, што з кіраўніцтвам горада мы знайшлі агульную мову. Акрамя таго, зараз прыйшоў час для свабоднай творчасьці, для поўнай самарэалізацыі. Гэта мой час, і я адчуваю сябе ў ім надзвычай свабодна».

Гэтыя словы найлепш тлумачаць, чаму Рыгор Сарока зьяўляецца акумулятарам неверагоднай энергіі і жыцьцёвай сілы. Ён здольны знаходзіць, адкрываць, аб'ядноўваць вакол сябе такіх жа дзелавых, энергічных людзей, як ён сам, заражаць іх сваім тэмпераментам. І, можа быць, дзякуючы такім людзям фестывалі беларускай песьні пачалі праходзіць менавіта ў Маладзечне?..

На канцэрце ў зале Белдзяржфілармоніі. Саліст — Ігар Алоўнікаў.



Тут нельга не ўспомніць чалавека, які аказаў значны ўплыў не толькі на дзейнасьць Р. Сарокі, але і наогул на ўсё культурнае жыцьцё Маладзечна. Гэта мэр горада доктар тэхнічных навук Генадзь Дзьмітрыевіч Карпенка, якога часта можна ўбачыць на канцэртах і фестывалях маладзечанскіх артыстаў. За даволі сьціслы тэрмін маленькі непрыкметны гарадок ператварыўся ў прыгожы, сьветлы, утульны цэнтр з разьвітымі эканомікай і культурай. Генадзь Дзьмітрыевіч стварыў такія спрыяльныя ўмовы для дзелавых, актыўных людзей, што жыцьцё ў гэтым ціхім горадзе літаральна завіравала. Толькі за апошні час тут зьявілася шмат камерцыйных банкаў, створаны абласныя тэатры — драматычны і лялечны, адбыліся два фестывалі беларускай песьні (цалкам фінансаваныя прадпрымальнікамі), а таксама тэатральны фестываль. Менавіта ў Маладзечне ўпершыню ў рэспубліцы быў арганізаваны першы аўкцыён па продажу нерухомасьці (у ім удзельнічалі і прадстаўнікі культуры, якія здолелі на той час набыць самастойнасьць).

У горадзе зараз можна назіраць вельмі цікавую і прыемную зьяву: тут адбываецца цеснае спалучэньне, зрастаньне эканомікі і культуры, духоўнага пачатку, прычым ініцыятарам у гэтым працэсе выступае культура, адным з цэнтраў якой зьяўляецца музвучылішча.

Сваю высакародную справу Р. Сарока распачаў задоўга да прызначэньня дырэктарам. Так, 19 гадоў назад ён упершыню сабраў лепшых выкладчыкаў вучылішча на першую рэпетыцыю камернага аркестра народных інструментаў. Яны ігралі, зьбіраючыся ў свой вольны час, пераадольваючы ўласную інертнасьць і не атрымліваючы ніякай матэрыяльнай падтрымкі. Разам з першымі канцэртамі прыйшоў і першы посьпех. Колькі потым было гэтых канцэртаў — цяжка падлічыць, і гэта, заўважце, па-за межамі асноўнай педагагічнай працы. Цяжка пераацаніць ролю камернага аркестра ў музычна-эстэтычным выхаваньні мясцовай публікі. На працягу многіх гадоў ён рыхтаваў сёньняшні культурны ўзьлёт Маладзечна.

Зараз камерны аркестр добра вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі — у Венгрыі, Германіі, Іспаніі. Аркестр заваяваў дыплом лаўрэата некалькіх фестываляў у Беларусі і Германіі, зроблены таксама яго аўдыё- і відэазапісы ў Германіі і Іспаніі. Сёлета Рыгор Сарока перадаў кіраўніцтва камерным аркестрам свайму пераемніку — Леаніду Алейніку, каб цалкам засяродзіць творчыя намаганьні на сімфанічным аркестры.

Гэты калектыў Рыгор Сямёнавіч узначальвае пятнаццаць гадоў. Раней ім кіравалі вядомыя музыканты: народны артыст РБ М. Казінец, выкладчыкі БелАМ Ю. Новікаў і З. Шаціла і інш. Пад кіраўніцтвам Р. Сарокі аркестр набыў статус гарадскога. У сімфанічным аркестры Маладзечна іграюць выкладчыкі, студэнты музвучылішча, таксама выкладчыкі ДМШ і Школы мастацтваў горада.

У калектыве шмат агульнага з сапраўдным філарманічным аркестрам. Тут ёсьць свой дырэктар, бібліятэкар, канцэртмайстар і нават другі дырыжор, абавязкі якога выконвае вядучы выкладчык вучылішча Тамара Дубіна. Адметнай рысай аркестра зьяўляецца тое, што ён амаль цалкам існуе на спонсарскія сродкі. Кожны месяц на патрэбы аркестра прадпрымальнікамі пералічваецца не менш мільёна беларускіх рублёў (такому становішчу могуць пазайздросьціць нават дзяржаўныя канцэртныя ўстановы). Сістэма арганізацыі аркестра дакладная, як швейцарскі гадзіньнік, і гэта самым лепшым чынам адбіваецца на канчатковым выніку. Аркестр заваяваў некалькі лаўрэацкіх дыпломаў на конкурсах музычных вучылішчаў Беларусі, стаў двойчы лаўрэатам усесаюзных фестываляў народнай творчасьці. З ім супрацоўнічаюць вядомыя музыканты Беларусі: Я. Глебаў, В. Іваноў, В. Кучынскі, В. Скарабагатаў, І. Алоўнікаў, М. Жылюк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Канцэрт у г. п. Чысьць на адкрыцьці музычнай школы.

У час рэпетыцыі ў зале музвучылішча.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У апошні час кіраўніцтва Белдзяржфілармоніі пачало запрашаць гэты калектыў на галоўную канцэртную пляцоўку Беларусі. Канцэрт Маладзечанскага сімфанічнага аркестра, які адбыўся 2 сьнежня ў зале філармоніі, — не зусім звычайны. Гэтым канцэртам галоўны дырыжор аркестра адзначыў свой паўвекавы юбілей.

Адкрывала канцэрт глыбокая па зьместу уверцюра «Эгмант» Л. Бетховена, выкананая з сапраўды бетховенскім напалам страсьцей. Рухава, рытмічна арганізавана прагучаў соль-мінорны «Славянскі танец» А. Дворжака. А вось у мі-мінорным «Славянскім танцы» таго ж кампазітара хацелася б пачуць большую гукавую насычанасьць.

Сталыя творчыя кантакты маюць аркестравыя калектывы Маладзечна і заслужаны артыст РБ В. Кучынскі. Застаўся ў памяці вечар, прысьвечаны 25-годдзю творчай дзейнасьці артыста, які цалкам прайшоў у суправаджэньні Камернага аркестра Маладзечна. Вось і зараз В. Кучынскі застаўся верны сваёй свабоднай, артыстычнай манеры выкананьня. Высакародная кавація Валянціна з оперы «Фауст» Ш. Гуно падкупляла мяккім, цёплым лірызмам. Даспадобы прыйшліся слухачам непаўторна-бліскучыя куплеты Тарэадора з оперы «Кармэн» Ж. Бізэ, выкананыя сьпеваком у суправаджэньні сімфанічнага аркестра.

Звычайна ніводзін канцэрт калектыву не абыходзіцца без твораў беларускіх кампазітараў. Так было і на гэты раз. Цікава прагучаў рашучы «Танец» В. Іванова. Да глыбіні душы кранула непаўторна пяшчотная «Лірычная мелодыя» Я. Глебава. Сімфанічная паэма «Фінляндыя» Я. Сібеліуса, вытрыманая ў суровым, строгім стылі, завяршыла 1-ае аддзяленьне канцэрта.

Кульмінацыяй усяго вечара, безумоўна, зьявіўся Канцэрт ля-мінор для фартэпіяна з аркестрам Э. Грыга ў выкананьні вядомага піяніста заслужанага артыста РБ Ігара Алоўнікава і Маладзечанскага сімфанічнага аркестра. Колькі пяшчотнасьці, мяккасьці, гарачага пачуцьця было ўкладзена ў гэтае выкананьне! Зразумела, што тон тут задаваў саліст, якому ўласьціва цудоўнае валоданьне гукам, бурны тэмперамент. У асобе І. Алоўнікава мы маем піяніста сусьветнага класа. І гэта цудоўна, што ён жыве сярод нас, што мы маем магчымасьць чуць яго непаўторную ігру.

Адпаведна салісту гучаў і аркестр. Перад намі быў прафесійны калектыў, якому падуладны такія складаныя творы.

Потым было ўрачыстае віншаваньне юбіляра. Шмат прыемных, цёплых слоў было выказана ў яго адрас. Былі таксама сувеніры, падарункі, прывітальныя адрасы і мора кветак. Завяршыўся вечар выкананьнем урачыстага паланеза з оперы «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага і ўрыўкаў з «Вальпургіевай ночы» (опера «Фауст» Ш. Гуно).

Калі разважаеш пра такіх людзей, як Рыгор Сямёнавіч Сарока, можаш упэўнена сьцьвярджаць: 50 гадоў — гэта толькі пачатак новых творчых зьдзяйсьненьняў.

Фота В. Пульскага і Ю. Церабуна.